Цэна асобнага нумеру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, панінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VII. 23 лістапада 1912 г. №. 47.

*Вільня, 22 лістапада.*

Зачаўся сёмы год жыцьця «Нашай Нівы», як прэдстаўніцы будзічагося беларускаго адраджэньня. Многа надзеі і жаданьнеў такі асталося надзеямі і жаданьнямі, але і свядомых беларусоў ужо не паралічыш на пальцах, як 6 гадоў таму назад, яны ужо завяліся у кожным глухім кутку Беларусі.

Беларускі рух, як новая сіла і новы дар у агульна-людзкую культуру, ужо прызналі усе паступовые шырокіе кругі грамадзянства ва ўсей Расеі і заграніцай. Усе паступовые партіі у Думе унясьлі у свае праграмы—прызнаць за беларусамі права на родную мову у цэркві, касьцелі, школі, судзе.

Як толькі жыцьцё усей Расеі прабудзіцца і павеець другім ветрам, то нашы жаданьня выпаўняцца абы толькі мы самі так шанавалі і любілі усё сваё роднае беларускае, як у евангелі сказана. „Хто многа ўзлюбіў, таму многа і дасцца». Беларусь шырока раскінулася і жывуць у ей мільёны нашаго народу, але народ хоць маець свой гаспадарскі здаровы бацькоўскі розум, але зразумець шырокіе размахі агульнаго краёваго звароту жыцьця яму цяжка, трэба яму для кірунку сваей долі мець больш сваей інтэлігенціі; сваіх камандзероў, сваіх пакутнікоў. А такіх эдукаваных людзей беларусы маюць менш, за которую другую націю у Расеі. Велікарусы маюць багатую духам знаньнем і любоўю да народа інтэлігенцію, у Польшчы можна знайсці цэлые тысячы людзей, каторые аддаюць усе сілы для народу, у латышоў многа мужыцкіх сыноў, кончыўшых высшые навукі садзяцца назад у вёску, на бацькаўскі загон, каб жыць разам с сваім родным народам і прынасіць свaей навукай яму карысць. У літоўцоў развіваецца такі самы рух—„к народу!“ там працуюць над адраджэньнем народу інтэлігенція, ксяндзы—літоўцы.

У нас жэ як толькі беларус падвучыцца трохі, ён усімі сілами адрэкаецца ад роднай беларускай культуры і народу і прыстаець, або да расейскай культуры, або да польскай, ды стараецца да гэтаго цягнуць і свой народ. Хоць гэтаго ужо ня можна сказаць пра ўсіх. Многа маладзежы цяпер ёсць, што стараецца вярнуцца посьле навукі у свой край, да свайго народу і лічыць гэта за першую і сьвятую павіннасць, ісці не да сільнага і багатага, а да слабога і беднага. Хоць варункі жыцьця у нашым краю не пазваляюць многім узяцца за працу.

І многіе за разные выгоды за свой спакой, як апостал Пётр, катораго, калі спыталася стража: «і ты з Ім»?—адрокся ад Хрыста, сказаўшы, „я яго ня ведаю“!

**А. Ў**

## Чацьвёртая Гасударственная Дума.

15 наября адкрылася Гасударственная Дума. Выбары, як ведама ішлі пад моцным кірункам духавенства, так што спадзеваліся, што Дума будзе саўсім правая.

Але усе рахункі людзей, што кіравалі выбарамі разбіліся; правые пад камандай Замыслоўскаго (выбраны віленскімі мужыкамі і духоўнымі), Пурышкевіча, Хвастова, Балашова, едучы у Пецербург думалі, што яны будуць гаспадарамі Думы і хацелі выбраць свайго прэдседацеля.

Але аказалася, што дух большай часці дэпутатоў, саўсім іначэй пастроен, на іх адбілося, тое што думаець старана аб правых. Прэдседацелем Думы выбрала левая старана Радзянку (акцябрыст ад кацерынаслаўскай губ.). За Родзядку далі галасы акцябрысты, прагрэсісты, палякі, ка-дэты, трудавікі і соціал-дэмакраты, усяго разам 251 голас, правых аказалося 150 галасоў, яны іх далі проціў Радзянкі.

Калі правые і націоналісты зразумелі што іхняя сіла нічога у Думе не значыць, яны усе вышлі з залы заседаньня, так скамандавалі Замыслоўскіе і Пурышкевічы. Усе прызнаюць, што гэты выхад ня меў сэнсу і быў безтактны. Пасьля новы прэдседацель Родзянко сказаў мову. Ен сказаў, што першай і глаўнай мэтай народных прэдстаўнікоў гэта ёсць закрэпленьне конституціі (новаго законнаго парадка) і заведзеньне цьвёрдых і для ўсіх пільна патрэбных законоў, і адмена „надзвычыйных ахран“, каторые даюць ўласць адміністраціі без суда, сваей воляй караць.

Родзянка потым паехаў прэдставіцца Гасудару Імпературу, і быў там 25 мінут,

З выбароў ешчэ ня можна прарочыць пра Чацьвёртую Думу. Калі акцябрысты ня злучацца с правымі, чаго можна спадзевацца, то правые ня будуць мець у Думе ніякай вагі.

# Вайна.

У гэты тыдзень на полю вайны мала чаго новаго здарылося: балгары усё стаяць перэд чаталджынскімі акопамі каторые ім закрываюць дарогу у Константынопаль і пачынаюцца перэгаворы аб згодзе, але абодвы супраціўнікі выстаўляюць свае варункі ведаючы, што на іх ня згодзяцца, а тым часам і баўгары і туркі напаўняюць сваё войска новымі сілами. Да баўгароў падвозяць новобранцоў, да туркоў мала-азіякае войска каторае дагэтуль стаяло у Сьмірні.

Дух у Турэцкім войску падняўся дзякуючы таму, што прыбылі новые сілы і што туркі у гэтым часе колькі разоў адкінулі атакі баўгароў. І можна было б спадзевацца, што туркі рынуцца на баўгароў з імпэтам з адсьвежэнымі сіламі каб ня тое, што у турецкай арміі страшэнна шырыцца халера.

Гэта пошасць, як кажуць і ёсць глаўнай прычынай, што баўгары усё стаяць на мейсцы. Апрача таго баўгарам дужа патрэбна тое войска, каторае облажыло Адрыанопаль які дагэтуль ешчэ не здаўся і трымаецца пад страшным агнём баўгарскіх гармат. А здабыць баўгарам Адрыанопаль гэтак сама важна, як туркам утрымаць яго, бо ад таго пры кім будзе Адрыанопаль залежыць, можна сказаць, панаваньне на Балканах. І туркі ня пойдуць на згоду датуль пакуль у іхніх руках Адрыанопаль

Сэрбія за гэты час здабыла тры гарадкі і яе войска знаходзіцца цяпер усяго за 15 вёрст ад Дурэццо на Адрыатычным моры.

Чорнагорцы грызуць усё ешчэ крэпасць Скутары і ніяк ня могуць здабыць яе. Цяпер чорнагорцы ужо не штурмуюць Скутары, а толькі аблажыўшы стаяць каля яе, бо спадзеваюцца, што туркі здадуцца з голаду.

## З нашаго жыцьця.

**Чытачы злучайцеся!**

Колькі гадоў, ешчэ, таму назад нельга было гаварыць аб якой колечы практычнай працы беларусоў, бо было мала людзей сьвядомых; але цяпер, калі газэта наша пашла шырока па Беларусі, то ўжо можна, а нават і трэба нам прыступіць да практычнай працы.

За час національнаго нашаго упадку, упало усё у нас: і мова, і навука, і рэмясло, і сельская гаспадарка. На людзях, каторые адрадзіліся самі, усьвядоміліся, ляжыць цяпер абавязак працаваць шырэй, адраджаць нашу старонку.

## Недапечэны муж.

— Эх, і слаўная баба у нашага Стонькі, эх слаўная... ну адным словам—чырвоная ягадка, проста дзіва, што за Паўлінка! каб ды наш Стонька удаўся у яе... во бы парачка важная была! Ды не! Дзе Стоньку дайсці да яе: дурэнь... недапечэный!

Гэтак расказываў дзед Габрусь свайму суседу з другой вёскі, аб сваіх вясковых суседзях, нідаўна ажаніўшыхся—Стоньку Грыжану і яго жонку Паўлінку.

— Ты сам, брат, падумай, пасудзі, я раскажу табе як было тут нідаўна... перад Вялікаднем; як і табе ведама, Паўлінка жыла у Піцеры у паноў кухаркай; кажуць слаўная кухарка была: умела пірагі пячы і разные прысмакі рабіць, так што, кажуць, як возьміш у губу, так і не пачуеш як ён... шусь,—кусок той,—і распусьціцца у губі.

Ну, вот, захацелася ей прыехаць, пагасьціць у нашую вёску... даўно, ведаеш, не была; як яе ні ўдзержывалі паны тые, як не угаварывалі, каб ня ехала—не паслухала, прыехала на Мясаедзе.

Увідзеў яе Стонька... улюбіўся. Што ж малец ён, праўда, прыгожы, багаты. Ну слова, па слову, сьмех ды жарты—улюбілася у яго і Паўлінка. Можэ паквапілася на багацьце, хто яе ведае. Хоць і казалі ей, што ён... таго... недапечэны трохі, — не паглядзела, згулялі вясельле. Што-ж, грашыць Богу нечэга: жывуць добра, але ўсё-ж ён дурэнь, часта па дурацку што зробіць, людзям толькі сьмех, а ей і сьмех і дакука, што муж гэткі цюха-міцюха. Ну, вот хоцьбы і перад Вялікаднем... Усякі к сьвяту хочэць што небудзь лепей прыгатаваць, паесьці пасьля даўгога посту. Стаў Стонька да жонкі прыставаць:

— „Ты зроб, ды зроб што нібудзь як у паноў рабіла ты разные прысмакі!

— „Добра, кажэ, зраблю!“ Але ты зьезьдзі у мястэчка у краму, купі там таго, сяго, ну, словам, што траба было ей купіць.. я і забыўся што... толькі помню, казала: „купі шафрану, не забудзься!“

Рад Стонька старацца. Жыва зьезьдзіў да жыда, купіў усякага, а шафран і забыўся.

— „Ну а шафран дзе?“ — Пытаецца у яго жонка: і не купіў мусі? Як-жэ я зраблю табе смачны пірог без шафрану... а прыстаець ешчэ: зроб, ды зроб... Эх ты цюха! Праўду і казалі мне, што ты недапечэный!“

— „Ну, ну, кажэ, не сярдзіся жонка: зьежджу ешчэ,—прывязу... нідалёка віць!“

І вот паехаў ешчэ. Што не падумаець, а ўсё шафран ўспамінаець, каб не забыцца, як зваць— і так усю дарогу:

„Но, но-о, кося, но, но... шафран, шафран;—пашоў, пашоў скарэй... шафран, шафран. Іш ты, скаціна, ешчэ спатыкаецца... шафран, шафран; пасьпешай, кратайся, бурка, скора крама... відзіш... шафран, шафран! Вот і прыехалі, бурка! Іш змардаваўся як шэльма Тпру-у! стой!.. купэрвас, здаецца жонка казала купіць“...

— „Эй, Бэрка! дай мне на дзесятку купэрвасу: забыўся тады купіць, а крэпка нада!

— „Жара, жара, пане Станіславе, ёсць, чаму не?“ — кажэ жыд. І даў яму на дзесятку, значыць, купэрвасу. Як відзім, братка ты мой, наш Стонька усю дарогу цьвярдзіў „шафран, шэфран“, а як пад'ехаў да крамы, дык і перэблублутаў: купіў заместа шафрану,.. купэрвасу! Ха-ха-ха, ды так і не дагадаўся і прывёз жонцы... купэрвасу... ха-ха-ха!

— „Ну, міла, пячы пірагі смачные, харошые!“

Развярнула яна паперку, ды як кінець яму пакупку, як разсердінца:

„Ах ты дурэнь, раздурэнь, ну што-ж ты купіў тут... ці-ж гэта я табе казала купіць!?..

Стаіць наш Стонька і губу расшырыў. Але-ж відзіць, Паўлінка, што дурня ня зробіш разумным, калі ужо Бог гэтага раней не зрабіў, якім радзіўся, такім памрэць. Махнула толькі рукой:

«Ладна, кажэ, спяку я табе абы які пірог; які спяку—такі і добра... нічога ты добрага ня відзеў на сьвеці, дык нечэга табе і думаць аб чым добрым“.

Залатая Паўлінка, слаўнае сэрцэ у яе: не крычала болей, як другіе бабы... другая ад злосьці, то аж ад розуму адышла б, а яна не!

Дык вот, братка ты мой, як людзі жывуць на сьвеці.

**В. Пілін.**

*Краслаўка.*

Найперш прагледзім, што у нас трэба зрабіць, а пасьля пагаворым як гэта зрабіць.

Калі едучы праз нашу старонку паглянем кругом, то убачым, што у нас бедната, цемната: вёскі паўрасталі у зямлю і парасьлі мохам, поле засорэны розным зельлем, у вёсках народ худы, бледны, цяжкі, хворы. А ўвойдзем у хату, паглянем на штодзеннае жыцьцё нашаго селяніна і мы убачым там столькі цемнаты, столькі забабоноў, што ажно страх возьме і дзіва, і жаль.

Сьвядомы, сьветлы чэлавек не павінен у гэткіх варунках сядзець злажыўшы рукі. Кожная пара рук, кожная сьвятлейшая галава у нашай вёсцы павінна працаваць, павінна ісці на ратунак цёмным, бяздольным братом сваім. Але калі мы будзем за гэту вялікую работу брацца у адзіночку, то ня здолеем: на вялікую работу, трэба і вялікіх сіл.

Вось-жэ у пэршы чарод чытачы „Нашай Нівы“, у кожнай ваколіцы павінны пазнаеміцца паміж сабой і час ад часу зьбірацца на гутаркі, як што рабіць. А каб было больш людзей да працы, трэба старацца шырыць Нашу Ніву, каб было як можна болей рук да працы.

Першу працу трэба пачаць ад залажэньня сельска гаспадарскаго кружка, бо беларусы найбольш землеробы. Залажыўшы кружок можна час ад часу людзей збіраць на супольные гутаркі, а на такіх гутарках, не адзін, то другі падасць нейкую разумную думку і гэту думку супольнымі сіламі можна будзе правясьці у жыцьцё.

Есць німала у нашай старонцы вялікіх вёсак і сёл, вось на вялікіх вёсках і па сёлах трэба пазакладаць сельска гаспадарскіе кружкі. Кружок сельска-гаспадарскі павінен мець сваю хату у каторую збіраліся-б людзі на гутаркі, пачытаць «Нашу Ніву» і сельска гаспадарскую беларускую часопісь „Саху“, а такжэ іншые карысные часопісі і кніжкі.

А каб тые карысные перамены і палепшэньня, што урадзяць на сабраньнях і вычытаюць с кніжэк можна было правясьці у жыцьцё, патрэбны грошы. Грошы вёска з ўсёды молэ мець на папраўку гаспадаркі за танны працэнт і на доўгі тэрмін, калі заложыць пазычковую кассу. Пазычковым касам Гасударственны банк пазычае грошы, а упраўленьне кассы ат сябе распазычае грошы сваім членам.

Трэба у кожнай вёсцы залажыць хаўрусную краму, праз каторую-б селяне прадавалі агульна сельска гаспадарскіе прадукты: мяса, масла, яйкі, збожжэ і інш, па больших цэнах, як перакупшчыкам. І ў каторой куплялібы усе патрэбные рэчы для хаты: цукер, табаку, газу і інш., каб заработак с торгу аставаўся самім селянам, каторые-б дзялілі яго паміж «абой» у канцы году, а не аддавалі дармо у кішэнь крамнікоў.

Трэба закладаць на вёсках пажарные тavailable таварыствы, каб на прыпадак пажару кожны ведаў за што хапіцца і як трэба бараніць.

Трэба каб у кожнай вёсцы была хаўрусная абшырная лазьня, бо ад чыстаты і здароўе вядзецца.

Трэба каб кожная вёска агульным коштам пасылала аднаго хлапца у школу сельскай гаспадаркі і адну разумнейшую кабаціну на акушэрскіе курсы. Хлапец навучыўшыся гаспадаркі, жывучы пасьля у вёсцы навучыў-бы другіх гаспадарыць і дваў-бы розные рады. Кабеціна кончыўшы курсы акушэрыі (на гэтые курсы трэба адзін год навукі пры бальніцы у горадзе) памагала б кабетам пры радах і маючы малую аптэчку пад ру амі у сябе давала-б раду у наглых прыпадках.

Вось мені-болей найпільнейшые патрэбы нашай вёскі каторых мы павінны дабіцца.

Кажэм „дабіцца“ але тут папраўдзі і дабівацца німа чаго, трэба толькі найперш каб чытачы „Н. Н.“ згаварыліся с сабой, пасьля склікалі людзей ахвотных і лепшых ды пыдпісаўшы нормальную уставу кружка сельска-гаспадарскаго падалі губэрнатару зацьвердзіць. Нормальную уставу можна віпісаць з рэдакціі „Нашай Нівы“.

Чытачы „Нашай Нівы“ гэто вялікая культутная сіла нашай беларускай вёскі, вось трэба, каб гэта сіла начала працаваць.

Чытачы „Нашай Нівы“ будзіце жыцьцё кругом сябе! Шырце добрае, вечнае!

## Калі нам будзе лепей?

Калі станем праглядаць карэспандэнціі „Нашай Нівы“ ад самаго яе нараджэньня і аж да апошняго нумэру, то усе яны зліваюцца у адзін зычны стогн, што нам дрэнна, што нам нешта баліць, цяжка жывецца на сьвеці.

І запраўды цяжка нам і трудна і нельга так быць далей, але як будзем аб гэтым пісаць у газэты і падаваць, не раз дужа разумные рады, каторые будуць прачытаны толькі рэдакціей і дзе якімі чытачамі, а дзелам, нічога рабіць ня будзем, ды нават часта-густа і самі будзем паступаць не паводле тых добрых радоў, то нічога ня зробім: трэба менеі слоў, але болей чыну, працы!

Дык вось што я хачу сказаць, ня тым цёмным і не пісьменным, але людзям, каторые як сьветлые аганькі зіяюць сярод цемні, чытачом і корэспандэнтам «Н. Н.» которые разумеюць палажэньне, каб узяліся да працы дзелам болей, чым славамі.

Кожны сьвядомы беларус павінен старацца жыць і рабіць сам так, як радзіць каб жылі і рабілі другіе. А першая і найбольшая патрэба нашаго адраджэньня гэта цьверозасць, працавітасць і асьвета.

Страшэнная хвароба, каторая разьедае душу і цела нашаго народу—гэта пьянства. Нарэкаюць на яго усе і усе у ім грэзнуць ды ў весь народ цягнуць у пагібель. Вось людзі сьвятлейшые на вёсках павінны арганізаваць каля сябе таварыствы цьверозасці і змагацца з гэтай страшнай хваробай словам і дзелам.

Прыродны мы маем недастатак працавітасьці. Праца—гэта крыніца дабрабыту і духоўнаго здароўя, затым мы павінны цаніць працу, цаніць час і на працавітасьці ды асьвеці будаваць сабе і свайму народу лепшую бдучыну.

Аб карысьці асьветы німа што і гаварыць. Адрадзіць народ свой, гэта не значыць, што толькі дабіцца каб было у нас многа газэт, многа кніжэк, каб усюды людзі гаварылі нашай мовай; гэтага мала! Трэба каб народ наш *адрадзіўся*, гэта значыць стаў сільным душой і целам, а здабіць гэткую сілу зможэм толькі праз цьверозасьць, працу і асьвету. Адным словам менеі нарэкайма, а больш працуйма. **Б. Свой.**

## Прывоз тавароў з заграніцы у 1911 г.

*Глядзіце № 46 «Н. Н.».*

У астатніе гады прывоз павялічыўся на адну трэціну. Найбольш павалічыўся прывоз гатовых фабрычных вырабоў. Прывоз сырых і напалавіну вырабленых тавароў падняўся больш чым на адну трэць (38%).

Прывоз харчавых прадуктоў павялічыўся на адну трэць.

Прывезена:

| | на мільёноў рублеў |
|---|---|
| Тканін розных . | 281 |
| Руды, металу, жалеза і вырабоў з іх . . . | 277 |
| Харчоў і жывёлы . | 138 |
| Вырабоў ад жывёлы | 81 |
| Апал: камен. вугаль, нефть, смала . | 80 |
| Хімічэскіе прадукты | 53 |
| Лясные тавары, кошыкарскіе вырабы | 41 |
| Пепера . . | 31 |
| Вырабы з іх . | 25 |
| Адзёжа, галянтэрск. тавар . . | 15 |
| Усяго на | 1.022 м. р. |

З харчоў надта узрос прывоз хлябоў —прывезена на 9 міл. руб. Найбольш прывозяць жыта с Прусіі—на $5^1/_2$ міл. руб., ешчэ многа селядцоў салёных на 21 міл. руб.

Сельска-гаспадарскіх машын прывезена на 5 міл. руб.; шпагатоў для скоравязалак—на 500 тыс, руб. Бадай палавіну (47%) заграінічнаго тавару куплена у немцоў. На такое вялікае і багатае прыроднымі дарамі расударства як Расея гандэл саўсім невялікі, значыць народных багацств збіраецца за год мала. Увесь парадак нашаго жыцьця такі, што і духоўные і матэрьяльные багацтвы мала растуць а прадукціўнасць народнай працы саўсім

## Ліст з вёсак у горад братам стрыечным.

Даражэнькіе браточкі, Баўтручок, Базылька, Змітручок і Язэпка! Я ня ведаю, што з вамі зрабілося? Здаецца і вы радзіліся ў вёсцы, вучыліся ў курных хатах пры лучыне, елі хлеб з мякінай і бульбу, — ўсё гэтак сама, як і я, але цяпер я нешта іншае бачу.

Вы эдукацыі малой, як і я, але вы ацёрліся каля расейцоў па версе і думаеце, як бытцым і зусім зрабіліся расейцамі; але гэта няпраўда: вы ўсё ж такі беларусы.

На Беларусі вас маткі кармілі грудзьмі сваімі, калыхалі ў люльцы, спавівалі, гукалі стройна і шчыра сваей родненькай мовай, — і вы любілі тады сваіх матак.

Вы мусі памятаеце, як усе мы былі маленькіе, усе разам гулялі, былі ешчэ у адных кашулях, бяз парток, хадзілі пасьля навальніц па лужах, пасьвілі перш гусей, пасьля авечэк, а пасьля кароў с пастырем, дзядзькам Кастусём, і гулялі кучай з усімі хлопцамі і дзеўчатамі, што былі на пасьце з усіх вёсак. Мы нават у трубу трубілі: дзядзька Кастусь не шкадаваў яе нам... Па полю і па хмызьняках мы рэзалі яленец і лазу і дзёрлі лыкі на лапці, як сабе, так і хатнім; а пад восень рэзалі дубцы, плялі кошыкі, вязалі венікі сабе і жыду, на сернікі і табаку меняючы з ім.

Пакравамі нас, памятаеце?—аддалі у школу і пачалі вучыць адразу па расейску, па складам, але мы па расейску ніводнаго слаўца ня зналі, дык і дрэнна вучыліся; ня ўмелі лібізаваць,—і за гэта нас каралі. Многа новых слоў не разумелі: «заборъ», «лукъ», «свекла», «телѣга», «здѣсь» нам былі незнаёмы. Прывыклі казаць: плот, цыбуля, бурак, калёсы, тут. Як мы плакалі тады першы год вучэньня, што ня ведалі расейскай мовы, дрэнна вучыліся. Ці-ж вы гэта ўсё забыліся?

Бадай-жэ вас, браточкі! Ціж-ж можна забыць бацькоўшчыну з ігрышчамі, хрэзьбінамі, вясельлямі, на которых стройна іграюць скрыпкі, цымбалы і дуды, стройна скачуць лявоніху і другіе розные нашы танцы, пяюць песьні, што як пачнеш слухаць іх, дык неяк аж за сэрцэ шчыпле і хочэцца плакаць з радасьці. Не, гэтаго нельга забыцца, нельга забыцца і усяго багацтва прыроды, тых птушэк, што на разные галасы пеялі, крычалі і ляскалі на ўсе балоты, на ўсе лясочкі і хмыразьнікі, хаваючыся у зялёненькіх бярозках, асінках і вольхах ды каля рэчэк у кусточках. Не, гэтаго нельга забыцца,— і мне здаецца, што вы ешчэ не зэбыліся. Вы не забыліся, як на вёсках у доўгіе вечары восеньню казалі старые нашы казкі, як пеялі песьні дзеўчаты на вячорках, загадывалі загадкі хлопцы. Памятаеце пэўне і маіх сясьцёр, каторые разам з вамі хадзілі пад жыта, рвалі васількі і чырвоные галоўкі палявога маку, плялі стройные вяночкі, клалі вам, братам сваім, на галоўкі, як царам кароны, стройна пеялі, стройна скакалі. Не, вы гэтаго хіба ешчэ не забыліся?

Вы цяпер кажэце: Беларусоў німа! Беларусы гэто мужыкі, прастата не адукаваная, а пасьля эдукацыі беларусы павінны быць расейцамі. Бадай-жэ вас, браточкі, ліха ня ведало, як вы мыляецеся! Вы мусі ня ведаеце гісторыі нашай старонкі і нашаго народу і дзеля гэтаго так кажэце:

«Беларусоў не было і німа!»—Ці ж гэта праўда? Калі вы маткі Беларусі адракліся, то лепей маўчыце, а то неяк аж сорамна мне за вас. Дзе вы такую старонку убачыце, каб сыны адрэкаліся ад сваей бацькоўшчыны, не шанавалі сваей нацыянальнай гордасьці. Німа на сьвеці такога народу такой старонкі, апрача нашай! А чаму? Таму што народ наш беларускі не мае цяпер сваей інтэлігенцыі, таму што ён у цяжкіх варунках жыцьця згубіў сваю культуру.

Пачытайце гісторыю Беларусі і вы убачыце там, што калісь Беларусь мела высокую культуру. Кнігі пачалі друкаваць Беларусы раней за Палякоў і Маскву. Усе законы літоўскаго гасударства пісаліся і друкаваліся у беларускай мове, у гэтай мове вяліся і суды і парлямэнт літоўскаго гасударства і школы і цэрквы. Быў час што жыў наш народ Беларускі шырокім жыцьцём, жыцьцём культурным!

Дармо-ж вы з мяне сьмяецёся, што я вам лісты пішу па Беларуску, і апрача расейскіх чытаю і беларускіе газэты, кнігі і журналы. Па моему, дык і сорамна вам сьмеяцца са сваей роднай мовы беларускай, самі будучы косць с косьці і кроў с крыві беларусамі. Праўда, многа цяпер ёсць такіх, што як казаў калісь каштэлян Мелешка — хоць і наша костка... аднача чужым мясам абрасла...—Але гэта дрэнна. Дрэнна, што беларусы не уважаюць сябе і сваей роднай мовы. Вы цяпер парабіліся чыноўнікамі, сьвяшчэннікамі, вучыцелямі і адчураліся свайго родняго, беларускаго, заместа таго, каб сваей эдукацией, дайсці каторай дала вам спраможнасць мазалістая рука беларуса бацькі вашаго, і беларускі-маткі вашай, ішлі паднімаць і асьвячаць роднае беларускае, вы топчыце і аплёвываеце яго.

Чаго мы хочэм? Хочэм мы каб над крыўдай панавала праўда, а не на адварот. Хочэм, каб у кожным чэлавеку шанавалі чэлавека, а не яго адзежу і кішэнь. Каб нашы браты-суседзі з усходу і захаду пашанавалі у нас чэлавека і прызналі за намі і нашай мовай людзкіе правы, каб дзеткі нашы у школах вучыліся пачаткоў у роднай мове, каб у цэрквах і касцёлах прамаўлялі да нас у тэй мове у якой гаварыла да нас матка і каб праваслаўны цэркву, а каталік касьцёл лічыў сваей роднай маткай... Вось чаго мы хочэм. Гэтаго мы маем права дабівацца і верым дабьёмся, шкада толькі, што у гэтай барацьбе, за нашы людзкіе правы не бачым вас, браточкі, поплеч нас, а супроць нас.

Выбачайце за доўгі ліст, бывайце здаровы.

**Брат ваш Ілюк Чалееўскі.**

